

БУДНІ КАЛОНІІ ДЛЯ НЕПАЎНАЛЕТНІХ **3**



КАЛІ ЧАКАЦЬ ГРЫП? **5**


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

27 ЛІСТАПАДА 2019 г.
СЕРАДА

# ЗВЯЗДА

№ 225 (29092)


# Бяспека — міжнародная, рэгіянальная, інфармацыйная

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 27—28 лістапада наведае з рабочым візітам Кыргызстан, дзе возьме ўдзел у сесіі Савета калектыўнай бяспекі АДКБ. Аб гэтым паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

Сёння пройдзе сумеснае пасяджэнне Савета міністраў замежных спраў, Савета міністраў абароны і Камітэта сакратароў саветаў бяспекі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Плануецца абмеркаваць каля 20 пытанняў, большасць з якіх будзе вынесена на сесію Савета калектыўнай бяспекі.

Афіцыйны сайт арганізацыі паведамляе, што шэраг пытанняў парадку дня, у прыватнасці, звязаных з праблемамі міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі і сітуацыяй у зоне адказнасці АДКБ, члены Савета калектыўнай бяспекі абмяркуюць у вузкім складзе (кіраўнікі Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі і Таджыкістана). Пасля гэтага пройдзе пленарнае пасяджэнне Савета калектыўнай бяспекі, дзе да лідараў дзяржаў далучацца міністры замежных спраў, міністры абароны і сакратары саветаў бяспекі дзяржаў — членаў АДКБ.

Аляксандр Лукашэнка ў сваім выступленні на саміце абазначыць пазіцыю і асноўныя прапановы беларускага боку па развіцці і ўмацаванні міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі ў розных яе сегментах. Традыцыйна на палях саміту кіраўнік беларускай дзяржавы правядзе сустрэчы і перагаворы з замежнымі калегамі.

На парадку дня сесіі — абмеркаванне праблем міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі, пытанні ўмацавання таджыкска-афганскай мяжы, узаемадзеянне з ААН па рэалізацыі Глабальнай контртэрарыстычнай стратэгіі і каардынацыя знешнепалітычнай дзейнасці дзяржаў — членаў АДКБ, развіццё ваеннага патэнцыялу арганізацыі і ўдасканаленне механізмаў супрацьдзеяння выклікам і пагрозам, у тым ліку ў сферы інфармацыйнай бяспекі, а таксама мерапрыемствы па святкаванні 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Усяго ў парадак дня пасяджэння Савета калектыўнай бяспекі АДКБ уключана 17 пытанняў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# Дзе «прачынаюцца» робаты?



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

У Краснапольскай гімназіі ўжо некалькі гадоў працуе гурток, куды кожны ахвотны можа прыйсці і навучыцца падпісваць і праграмаваць робатаў. Старэйшыя вучні з задавальненнем перадаюць свае веды малодшым школьнікам.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЯРАШЭНКА, кіраўнік адміністрацыі кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень»:**

*«У цяперашні час ужо 17 рэзідэнтаў парка пачынаюць ажыццяўляць сваю гаспадарчую дзейнасць (шэсць з іх актыўна выпускаюць прадукцыю ў галіне машынабудавання, электронікі). Да канца бягучага года такіх прадпрыемстваў будзе не менш за 20, а ў 2020 годзе іх павінна быць 30».*

# ГАЛОЎНЫ ЭКЗАМЕН — НАПЕРАДЗЕ

**Прэзідэнт уручыў узнагароды спартсменам і трэнерам нацыянальнай зборнай па веславанні на байдарках і каноэ.**

Медаль «За працоўныя заслугі» атрымаў трэнер-выкладчык філіяла Гомельскага дзяржаўнага вучылішча алімпійскага рэзерву Міхаіл АЗЁМША, старшыя трэнеры нацыянальнай зборнай Мікалай БАНЬКО і Генадзь ГАЛІЦКІ. Гэтай узнагароды ўдастоены таксама спартсмены-інструктары нацыянальнай каманды Марына ЛІТВІНЧУК і Вольга ХУДЗЕНКА. Ганаровае званне «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь» прысвоена спартсмену-інструктару нацыянальнай каманды Арцёму КОЗЫРУ.

Нацыянальную зборную па веславанні на байдарках і каноэ кіраўнік краіны назваў самай стабільнай і паспяховай у дзесяцігоддзі, а іх від спорту — праўдзіва беларускім, бо яго традыцыі непарыўна звязаны са шматвяковай культурай і побытам Беларусі, краю тысячы рэк і азёр.

Беларускія балельшчыкі даўно прызвычаіліся да перамог байдарачнікаў і канаістаў на самых буйных міжнародных спаборніцтвах. З кожнага турніру, у тым ліку з Алімпійскіх гульняў, яны вяртаюцца з медалямі.

«У чэрвені падчас ІІ Еўрапейскіх гульняў я з вялікім задавальненнем гэта назіраў. Я ўважліва сачыў за гарачымі жнівеньскімі баталіямі на чэмпіянаце свету ў венгерскім Сегедзе, дзе вы даказалі, што беларусам сёння няма роўных у свеце», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Бадай, самы значны доказ гэтым словам і асаблівая падстава для ўшанавання — чатыры залатыя, два сярэбраныя і два бронзавыя медалі Марыны Літвінчук і Вольгі Худзенкі, золата Арцёма Козыра на ІІ Еўрапейскіх гульнях. Усяго па выніках спаборніцтва беларускія байдарачнікі і канаісты заваявалі дзесяць узнагарод. Пераможную серыю спартсмены працягнулі і на чэмпіянаце свету ў венгерскім Сегедзе, дзе зборная ўзяла 14 медалёў, шэсць з якіх — залатыя. Спартсмены перамаглі ў камандным заліку і пакінулі ззаду іншых лідараў сусветнага веславання — зборныя Германіі, Венгрыі, Кітая, Расіі, Новай Зеландыі.

СТАР. 2

## Фінансавая палітыка

# Крокі да ўстойлівасці

### Запаволенне інфляцыі не прывядзе да абмежавання эканамічнага росту

**Эксперты адзначылі, што інфляцыйныя чаканні наўпрост залежаць ад рэальных інфляцыйных усплёскаў на рынку.**

**Перад пачаткам семінара «Палітыка для росту», які праводзіўся ў Нацыянальным банку, намеснік старшыні праўлення гэтага ведамства Дзмітрый КАЛЕЧЫЦ расказаў пра далейшыя крокі па забеспячэнні ўстойлівага развіцця беларускай эканомікі. У прыватнасці, ён заявіў, што «цяпер вельмі важна сканцэнтраваць усе намаганні на мэтах эканамічнага развіцця краіны. Пачата распрацоўка пяцігадовай праграмы. Тыя ідэі, якія будуць крышталізавацца ў рамках абмеркаванняў, могуць увайсці ў праграму, якая вызначыць, куды будзем рухацца».**

### Патрабуецца карэкціроўка заканадаўства

Неабходная ўмова для ўстойлівага развіцця — макраэканамічная стабільнасць. Гэтае паняцце складаецца з двух элементаў — фінансавай і цэнавай стабільнасці. «Менавіта падобныя пытанні мы разглядаем у якасці асноўных мэт Нацбанка. Адпаведныя змены ў заканадаўстве неабходныя для таго, каб мы маглі эфектыўна рэалізоўваць гэтыя задачы, унесеныя на разгляд у органы дзяржаўнага кіравання. Разлічваем на цесны дыялог і ўзаемадзеянне ў гэтай галіне з нашымі калегамі з іншых эканамічных ведамстваў, а таксама на тое, што гэтыя змены будуць падтрыманыя і прынятыя», — адзначыў Дзмітрый Калечыц.

На семінары абмяркоўваліся пытанні ўзаемадзеяння Нацбанка з Міністэрствам фінансаў. Гаворка вялася пра тое, што «збалансаванасць падаткова-бюджэтнай і пазыковай палітыкі з'яўляецца краевугольным каменем з пункту гледжання эфектыўнасці рэалізацыі нашых мэт і ў цэлым забеспячэння макраэканамічнай стабільнасці, а значыць, і ўстойлівага эканамічнага росту».

СТАР. 2

## Гістарычнымі маршрутамі

# КАРОЛЬ І КАРАЛЕВА СЯДУЦЬ НА РОВАР...

### Унікальны веламаршрут па каралеўскім тракце рыхтуецца ў Гродне

**Ён пачнецца ад дома былога гродзенскага старасты Антонія Тызенгаўза і завершыцца каля такога ж аб'екта ў польскай Сакулцы. Агульная працягласць маршрута — 60 кіламетраў, прыблізна па палове з кожнага боку. Падарожнічаць можна на звычайным ровары, тандэме або ровары з электрычнай цягай.**




Кароль і каралева на ровары — не проста метафара, гэта лагатып трансгранічнага праекта, які з размахам пачаў рэалізоўвацца па абодва бакі беларуска-польскай граніцы. Аб яго значнасці сведчыць і бюджэт — 2,1 мільёна еўра. Гэтая сума падзелена паміж двума партнёрамі, беларускі бок атрымаў 1,1 мільёна еўра.

— Адсыл да каралеўскай эпохі невыпадковы, — тлумачыць **кіраўнік праекта Сяргей КАЛЯДА.** — Менавіта кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі прызначыў таленавітага палітычнага дзеяча і свайго сябра Тызенгаўза гродзенскім старостам, які, у сваю чаргу, здзейсніў тут прамысловую рэвалюцыю. Другая палова XVIII стагоддзя была эпохай росквіту горада, тут ствараліся мануфактуры, адкрыўся першы тэатр, быў забудаваны цэнтр горада, дзе ў той час знаходзілася прыгарадная вёска Гарадніца.

СТАР. 6

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Землятрус у Албаніі: ахвяры і сотні пацярпелых



Эпіцэнтр размяшчаўся паміж сталіцай краіны Тыранай і другім па велічыні горадам Дурэсе. Ачаг залягаў на глыбіні 10 кіламетраў. Па звестках сейсмолагаў, услед за землятрусам рушыла чарада афтэршокаў магнітудай вышэй за 5. Штуршкі адчуваліся ў Тыране, а таксама ў Паўночнай Македоніі, Сербіі, Чарнагорыі, Босніі і Герцагавіне, Грэцыі, Харватыі і некаторых паўднёвых правінцыях Італіі. Ратавальнікі працягваюць разбіраць завалы, пад якімі могуць знаходзіцца ацалелыя. Разбураны некалькі будынкаў недалёка ад Дурэсе. Да месца трагедыі неадкладна выехаў прэзідэнт краіны Ілір Мета ў суправаджэнні міністра абароны. Паводле слоў прэм'ер-міністра Албаніі Эдзі Рамы, найцяжэйшая сітуацыя склалася ў Дурэсе і Тумана, аднак усе службы актыўна працуюць, каб выратаваць людзей. Улады Албаніі прынялі рашэнне адмяніць заняткі ў адукацыйных установах у трох гарадах рэспублікі — Тыране, Дурэсе і Лежэ. Гэта другі за тры месяцы землятрус у Албаніі.

### Ваенная разведка Ірака заявіла пра пагрозу адраджэння «Ісламскай дзяржавы»

Члены «Ісламскай дзяржавы» (ІД) рыхтуюць масавыя ўцёкі сваіх паплечнікаў з турмаў у Сірыі і ў Іраку, што пагражае адраджэннем гэтай арганізацыі нават пасля ліквідацыі яе лідара Абу Бакр аль-Багдадзі, заявіў у інтэрв'ю амерыканскаму каналу CNN кіраўнік ваеннай разведкі Ірака генерал-маёр Саад аль-Алак. Па словах генерала, яго ведамству ўдалося перахапіць звесткі аб падрыхтоўцы масавых уцёкаў тэрарыстаў. «Сусветнай супольнасці трэба прыкласці каласальныя намаганні, каб разабрацца з гэтай праблемай, бо злачынцы могуць пакінуць турмы і вярнуцца ў свае краіны. Яны ўяўляюць вялікую небяспеку для краін Еўропы, Азіі і паўночнага захаду Афрыкі», — падкрэсліў аль-Алак. Ён расказаў, што Багдад даў турэцкім уладам інфармацыю аб дзевяці меркаваных баевіках ІД высокага рангу, бежанцаў з Сірыі і Ірака ў Турцыю. Сярод іх ёсць і тыя, хто адказвае за фінансаванне дзейнасці тэрарыстычнай групоўкі. Паводле інфармацыі аль-Алака, баевікі будуць займацца вярбоўкай новых прыхільнікаў. Ён адзначыў, што двое з іх «адны з найлепшых вытворцаў бомбаў, якія калі-небудзь былі ў ІД».

### Tesla атрымала 200 тысяч заказаў на новую мадэль Cybertruck

Праз некалькі дзён пасля прэзентацыі новай мадэлі Cybertruck амерыканская кампанія Tesla атрымала каля 200 тысяч заказаў на футурыстычны браніраваны пікап. Гэтую лічбу кіраўнік кампаніі Ілан Маск паведаміў у Twitter. Ахвотныя набыць Cybertruck могуць зарэзерваваць для сябе адзін з аўтамабіляў, серыйны выпуск якіх плануецца пачаць у 2022 годзе. Для гэтага неабходна заплаціць заклад у суме 100 долараў, які пасля, у выпадку адмовы ад куплі, будзе вернуты. Кампанія — вытворца электрамабіляў у Лос-Анджэлесе прадставіла шасцімесны пікап Cybertruck. На яго дызайн найбольш паўплываў фільм пра Джэймса Бонда «Шпіён, які мяне кахаў», заявіў Ілан Маск. Версія з герметычным салонам стане «афіцыйным пікапам Марса», дадаў ён. Cybertruck будуць выпускаць у трох варыянтах з запасам ходу 250 міль (400 км), 300 міль (480 км) і 500 міль (800 км). Самая хуткая версія зможа разганяцца да 100 кіламетраў у гадзіну менш чым за тры секунды. Усе версіі новага электрамабіля ад кампаніі Tesla аснашчаны аўтапілотам і адаптыўнай падвескай. Цэны на Cybertruck пачынаюцца з 39 900 долараў.


ISSN 1990 - 763X

19225>

9 771990 763008


## КОРАТКА

- **Аляксандр Лукашэнка накіраваў падзячныя пісьмы аўстрыйскім лідарам за прыём беларускай дэлегацыі ў Вене.**
- Беларусь пераарыентуе пастаўкі цэменту на рынак Еўрасаюза замест Украіны.
- **Каля 15 універсітэтаў Беларусі плануецца мадэрнізаваць за кошт пазыкі Сусветнага банка.**
- Паслугі паштовай сувязі выключаюцца са сферы натуральных манаполій.
- **Бясплатныя кансультацыі правядуць 29 лістапада беларускія натарыусы.**
- У аграгарадку Зэльвенскага раёна з навагодняй назвай Елка адкрыюць рэзідэнцыю Дзеда Мароза.






# ТЭМПЕРАТУРА — УНІЗ, ПАЖАРЫ — УВЕРХ

**У халодную пару колькасць узгаранняў прыкметна ўзрастае. Гэта вельмі выразна відаць і па сёлетнім лістападзе. Мінулыя выхадныя выдаліся марозныя, і толькі за суботу давялося тушыць паўсотні пажараў, у якіх загінулі шэсць чалавек. За нядзелю звесткі яшчэ горшыя — 38 узгаранняў і сем ахвяр. За папярэдні ўік-энд, калі «за бортам» была плюсавая тэмпература, паказчыкі былі куды больш аптымістычныя.**

Сітуацыю каментуе **начальнік упраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Дзмітрый ТУРЧЫН.**

— Пажары пераважаюць у жылым сектары. Гэта звязана з тым, што людзі ў халодную пару года больш знаходзяцца дома. Пячное, электрычнае, награвальнае абсталяванне эксплуатуецца даўжэй і... не заўжды правільна. Дадайце да гэтага тое, што істотная частка пажараў пачынаецца ноччу. У сне чалавек пахі адчуваць няздольны.



Але прычына большай часткі ўзгаранняў трывіяльная — неасцярожнае абыходжанне з агнём. Прылёг чалавек адпачыць, закурыў і... заснуў, асабліва калі перад тым вырашыў «пагрэцца» яшчэ і алкаголем. Недакурак вывальваецца з аслабелых рук і падпальвае ўсё вакол сябе. Калі ўлічыць, што сучаснае жытло літаральна нашпігавана матэрыяламі штучнага паходжання, якія падчас гарэння выдзяляюць атрутныя рэчывы ў паветра, то далей усё залежыць ад дзвюх рэчаў. Аптымістычны варыянт — дома працуе аўтаномны пажарны апавяшчальнік, які сваім пранізлівым піскам абудзіць неабачлівага гаспадара. Але калі яго няма? Тады застаецца спадзявацца на тое, што пажар своечасова ўбачаць суседзі або мінакі. Аднак імавернасць таго, што гэта адбудзецца, калі яшчэ можна выратаваць чалавека, нізкая. А стаўка ў гэтай гульні — жыццё.

СТАР. 6